# Адбыўся семінар па ацэнцы ўзроўню лічбавізацыі галін і функцыянальных сфер

14 ліпеня 2020 г. у Міністэрстве сувязі і інфарматызацыі адбыўся семінар па ацэнцы ўзроўню лічбавізацыі галін і функцыянальных сфер Рэспублікі Беларусь у фармаце відэаканферэнцыі з удзелам прадстаўнікоў міністэрстваў, арганізацый галін і функцыянальных сфер эканомікі Рэспублікі Беларусь.

Мэтай гэтага семінара з'яўлялася навучанне прадстаўнікоў дзяржаўных органаў і арганізацый розных галін і функцыянальных сфер эканомікі Рэспублікі Беларусь методыцы разліку паказчыкаў ўзроўню лічбавізацыі. У рамках семінара разгледжаны асаблівасці запаўнення галіновых апытальных лістоў і прымянення методыкі збору даных для ацэнкі і прагназавання ўзроўню лічбавізацыі галін і функцыянальных сфер эканомікі Рэспублікі Беларусь.

Зараз ААТ «Гіпрасувязь» выконвае навукова-даследчую працу «Навукова-метадычнае суправаджэнне працэсу ацэнкі ўзроўню лічбавізацыі арганізацый, галін і функцыянальных сфер». На падставе атрыманай у ходзе семінара інфармацыі і падрыхтаваных метадычных матэрыялаў дзяржаўнага кіравання будзе рэкамендавана правесці ацэнку ўзроўню лічбавізацыі арганізацый, прадпрыемстваў і галін у цэлым.

Атрыманыя вынікі будуць выкарыстаны для фарміравання каротка-і сярэднетэрміновых планаў лічбавага развіцця галін і функцыянальных сфер эканомікі, выпрацоўкі мерапрыемстваў, рэалізацыя якіх дазволіць забяспечыць павышэнне ўзроўню іх лічбавізацыі.

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/16-07-2020-6590*